**УДК 1(476)**

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ ЯК ПАДМУРАК ДЗЯРЖАЎНАЙ ІДЭАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**В. М. Лянцэвіч**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,
дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
e-mail: liantsevich.volga@yandex.ru

**М. М. Пішч**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,
студэнт 3 курса факультэта права
e-mail: kolya.pishch@mail.ru

***Аннотация.*** *У артыкуле аналізуюцца асноўныя рысы дзяржаўнай ідэалогіі, у фарміраванні якой важную ролю адыгрывае нацыянальная ідэя, на асобных этапах развіцця беларускай дзяржаўнасці; вызначаюцца характэрныя рысы беларускай нацыянальнай ідэі на пачатку XX ст.; прапануецца комплекс мер для вылучэння абноўленай нацыянальнай ідэі на сучасным этапе развіцця беларускай дзяржавы.*

***Ключевые слова:*** *Рэспубліка Беларусь, нацыянальная ідэя, дзяржаўная ідэалогія, беларуская нацыя, «агульнае дабро».*

***Annotation:*** *The article analyzes the main features of the state ideology, in the formation of which the national idea plays an important role, at certain stages of development of the Belarusian statehood; the characteristic features of the Belarusian national idea at the beginning of the 20th century are determined; a set of measures is proposed to put forward a renewed national idea at the current stage of development of the Belarusian state.*

***Keywords:*** *Republic of Belarus, national idea, state ideology, Belarusian nation, «common good».*

Прынята лічыць, што людзі на працягу жыцця могуць змяніць свае палітычныя перакананні, але значна цяжэй змяніць сваю нацыянальнасць, паколькі разглядаецца яна як прыналежнасць індывіда да пэўнай этнічнай групы, звязанай агульнасцю мовы, культуры, звычаяў, традыцый, ладу жыцця. Сучаснае чалавецтва разглядаецца як сукупнасць нацый, падзеленых фундаментальнымі, нават непераадольнымі адрозненнямі, якія складаюць аснову нацыянальных дзяржаў. З гэтага пункту гледжання нацыя паўстае як неабходная аснова дзяржавы. Гэта тым не меней не перашкаджае ўсталяванню адносін паміж людзьмі розных краін, розных нацый; сапраўды, сучасны ўзровень развіцця камунікацый з кожным днём умацоўвае такія адносіны. Аднак калі б нацыянальныя адрозненні былі непераадольнымі, то гэтым адносінам было б наканавана заставацца ва ўладзе ўзлётаў і падзенняў

міжнароднай палітыкі: свет быў бы вечна няўстойлівым, міжнародны гандаль нестабільным, эканамічныя саюзы часовымі, а палітычныя саюзы паміж дзяржавамі немагчымымі.

Яшчэ ў перыяд перабудовы ў краінах СССР з'явілася цікавасць да самаідэнтыфікацыі, нацыянальная ідэнтычнасць стала прыярытэтам не толькі культурнага, але і палітычнага жыцця. Інтэрнацыянальная палітыка савецкай улады, фарміраванне штучнай супольнасці пад назвай «савецкі народ», ігнараванне на працягу дзесяцігоддзяў існавання нацыянальнага пытання ў шматнацыянальнай дзяржаве не прывялі да страты этнічнай самасвядомасці народаў СССР. Таму пасля распаду Савецкага Саюза ў снежні 1991 г. менавіта нацыянальны кантэкст кладзецца ў аснову фарміравання фундаменту суверэнных дзяржаў. Гэта прыводзіць да імклівага росту значэння нацыянальна арыентаванага накірунку ў дзяржаўнай палітыцы: афармленню дзяржаўнага статусу нацыянальных моў, змены савецкай дзяржаўнай сімволікі на нацыянальную, падтрыманню дзяржавай інтарэсу да нацыянальнай гісторыі і культуры. Дадзеная тэндэнцыя была характэрнай рысай для ўсіх постсавецкіх дзяржаў, праяўляючыся ў большай ці меншай ступені.

Гэта не стала нечаканасцю, бо любая дзяржаўная ўлада заўсёды павінна мець ідэйны падмурак — аснову для развіцця патрыятычных пачуццяў і асабістага вызначэння грамадзяніна як прадстаўніка сваёй Радзімы. Варта адзначыць, што адной з функцый дзяржаўнага кіравання з'яўляецца функцыя рэгулявання грамадскіх адносін, што вельмі актуальна ва ўмовах раз'яднанасці і няроўнасці ў грамадстве. Нацыянальная аснова як нельга лепей падыходзіла для таго крызіснага стану грамадства, каб аб'яднаць розныя сацыяльныя групы, вызначыць для іх агульны вектар далейшага развіцця дзяржавы і грамадства ва ўмовах, калі невядома было, куды крочыць далей.

Увогуле менавіта ідэалагічная палітыка дзяржавы спрые згладжванню рознагалоссяў у грамадстве, аб'ядноўваючы адной ідэяй і мэтай «агульнага дабра». Ідэалогіі фарміруюцца на ўзроўні асобных груп, аб'яднаных агульнымі мэтамі сацыяльнай кааперацыі. Ідэалогія дзяржавы — гэта кансалідуючы і стабілізуючы фактар інтэграцыі груп для вырашэння актуальных грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных задач сацыяльнай мадэрнізацыі на аснове дакладных, ясных і блізкіх грамадзянам сацыяльна-палітычных ідэй [1, с. 192].

У цывілізацыях Старажытнага свету ролю дзяржаўнай ідэалогіі адыгрывала, як правіла, рэлігія. Вялікае значэнне мела ідэалагічная палітыка для буйных па тэрыторыі дзяржаўных утварэнняў: так для Старажытнарымскай дзяржавы мілітарызм з яго імкненнем да нарошчвання ваеннага патэнцыялу, захопніцкія войны як інструмент знешняй палітыкі, па сутнасці, прадвызначылі тэндэнцыю развіцця дзяржавы амаль на пяць стагоддзяў. У насельніцтва

старанна выхоўваліся гэтыя мілітарысцкія настроі, што не ў малой ступені паўплывала на імклівы рост тэрыторыі Рымскай імперыі.

Новы вектар у дзяржаўнай ідэалагічнай палітыцы пасля тысячагадовага перыяду Сярэднявечча з яго татальным уплывам хрысціянства вызначаецца ў Заходняй Еўропе напрыканцы XIV ст. Гэта эпоха Адраджэння, для якой уласцівымі рысамі сталі гуманізм і антрапацэнтрызм. З культурнай сферы ідэі індывідуальнай свабоды чалавека перайшлі ў палітычнае поле. Рэнесансавая ідэалогія атрымала своеасаблівыя рысы на землях Вялікага Княства Літоўскага, куды яна трапіла на пачатку XVI ст. На першы план тут выходзіць ідэя «агульнага дабра» — самаахвярнай дзейнасці на карысць Айчыны. І. У. Вішнеўская вылучае тры адметныя формулы патрыятызму, якія складаюць у гэты час выбітныя беларускія мысляры: універсальную Ф. Скарыны, «…як любові да зямлі, на якой нарадзіўся, да мовы, з якой яго Бог у свет прывёў» [2, с. 36]; дэмакратычную С. Буднага і В. Цяпінскага, з павагай да народнай мовы і культуры; а таксама дзяржаўную, выразнікам якой стаў канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега, — у прадмове да Статута 1588 г. ён «…падымаў пытанні дзяржаўнай незалежнасці ВКЛ, дзяржаўнага статуса старабеларускай мовы» [2, с. 36].

На ролю ідэалогіі, якую, аднак, нельга назваць дзяржаўнай, прэтэндуе сарматызм, вядомы на тэрыторыі Каралеўства Польскага з XV ст., а на землях Вялікага Княства Літоўскага пашыраны з часоў Рэчы Паспалітай. На думку М. В. Лескінен, вытокі сарматызму першапачаткова мелі палітычны характар. У суседніх дзяржавах на першае месца выходзілі іншыя фактары фарміравання нацыянальнай самасвядомасці — такія як, напрыклад, гістарычныя карані. У Рэчы Паспалітай відавочна пераважалі палітычныя амбіцыі «шляхецкага народа», і сама шляхта была хутчэй палітычнай, чым сацыяльна-эканамічнай катэгорыяй [3, с. 62]. У той жа час М. В. Лескінен адзначае, што сармацкая ідэалогія стварала не толькі ідэал чалавека, якім становіцца сам сармат, але і ўзор дзяржавы — шляхецкую рэспубліку. Пры спробе абгрунтаваць сістэму шляхецкай дэмакратыі шляхам пошуку яе перадумоў у Святым Пісанні, а гістарычных каранёў — у антычнасці ўзнік сармацкі міф, які сцвярджаў, што ўсё насельніцтва Рэчы Паспалітай уяўляе сабой нашчадкаў двух розных народаў: шляхта — гэта нашчадкі слаўных «заваёўнікаў»: сарматы па крыві, высакародныя і слаўныя паводле сваіх прыродных якасцей; просты ж люд — гэта нашчадкі «заваяваных» плямёнаў: плебс і «быдла». Гэтым тлумачылася паўнапраўе шляхты і падпарадкаванае становішча астатніх слаёў насельніцтва. Безумоўна, сарматызм, на першы погляд, мае адценне дзяржаўнай ідэалогіі, але насамрэч такой не з’яўляецца, паколькі раз’ядноўвае народ, які жыве ў межах адной дзяржавы, і не можа быць кансалідуючым фактарам.

XIX ст. звязана ў гісторыі з фарміраваннем буржуазных нацый, а таксама складаннем перадумоў станаўлення сучасных нацыянальных дзяржаў. Для беларускай нацыі вырашальным становіцца канец XIX – пачатак XX ст., калі выспявае айчынная інтэлігенцыя, афармляецца беларуская нацыянальная ідэя, непарыўна звязаная з традыцыямі старажытнай, з часоў першых дзяржаўных утварэнняў IX–XIII стст., дзяржаўнасці, асэнсаваннем сваёй нацыянальнай самабытнасці, а таксама трывалай статутнай праваѡой традыцыяй [2, с. 168]. Аб існаванні самастойнай беларускай нацыі і яе праве на самавызначэнне ўпершыню загаварылі чальцы студэнцкай народніцкай групы «Гоман» у 1884 г. Паступова афармляліся ідэі неабходнасці дэмакратычных пераўтварэнняў, свабоды, сацыяльнай роўнасці (БСГ), каштоўнасці нацыянальнай мовы і культуры, якія стануць падмуркам для стварэння беларускай нацыянальнай дзяржавы.

Першай спробай стварэння такой дзяржавы становіцца Беларуская Народная Рэспубліка (1918 г.). Але хутка пасля заканчэння Першай сусветнай вайны абвяшчаецца дзяржава на савецкай аснове — Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь. Нейкі час беларуская культура развівалася «ў цяні» іншых культур, з чым звязаны складанасці выпрацоўкі нацыянальнай ідэі. Гістарычныя рэаліі садзейнічалі таму, каб Беларусь была часткай вялікага палітычнага і культурнага арганізма, — СССР.

Сапраўды, якасна новым становіцца перыяд пасля абвяшчэння суверэнітэту і стварэння Рэспублікі Беларусь. Працэсы арганізацыі ўнутрыдзяржаўнага жыцця эпохі незалежнасці звязаны з усведамленнем нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў і фарміраваннем палітычнай эліты дзяржаўніцкага тыпу, арыентаванай на абарону нацыянальных інтарэсаў [2, с. 257]. Менавіта тады на дзяржаўным узроўні фарміруецца запрос аб афармленні новай ідэалогіі, якая з’яўляецца важнейшай атрыбутыўнай прыкметай дзяржавы, якая выконвае функцыю мабілізацыі волі і намаганняў нацыі на забеспячэнне яе самазахавання і дынамічнага развіцця [4, с. 60]. І тут мы зноў звяртаемся да неабходнасці грунтавання дзяржаўнай ідэалогіі на адметнай нацыянальнай ідэі, адсутнасць якой можа прывесці да пранікнення чужых ідэалогій, якія не адпавядаюць асаблівасцям нацыянальнага светаўспрымання, светаадчування, мэтам развіцця дзяржавы і грамадства.

У 2003 г. у Беларусі быў узяты курс на пабудову ўсвядомленай ідэалагічнай палітыкі, якая будзе адпавядаць рэаліям сучаснасці з мэтай фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і згуртаванасці грамадства. У прыярытэт былі ўзведзены каштоўнасці народа, а ў выпадку адпаведнасці ім міжнародных стандартаў была ўстаноўлена канцэпцыя іх прыняцця. Распрацоўка канцэпцыі ідэалагічнага забеспячэння інавацыйнага развіцця

Беларусі была зроблена ў рэчышчы цывілізацыйнай і мадэрнізацыйнай парадыгмаў, канцэпцый сацыяльнага дабрабыту і справядлівасці. Найбольш універсальным бачыўся падыход, пры якім нацыянальная ідэя стаіць на трох кітах: любоў да Айчыны, гістарычная памяць, грамадзянскі абавязак. Але на пачатку 2000-х гг. агульная нацыянальная ідэя так і не склалася.

У сітуацыі, якая склалася на сённяшні дзень, актуалізуецца праблема вылучэння новай нацыянальнай ідэі, якая будзе адпавядаць патрэбам сучаснага этапу развіцця беларускага грамадства, яго прававой сферы, заснаванай на нацыянальных каштоўнасцях, «дазваляючай народу і дзяржаве сцвярджаць сваю ідэнтычнасць, пазбягаць сацыяльна-псіхалагічнай і культурнай залежнасці ад вонкавых цэнтраў уплыву, быць абароненым ад дэструктыўнага ідэалагічнага і інфармацыйнага ўздзеяння, захоўваць гістарычную памяць, прытрымлівацца сваіх ідэалаў і захоўваць вернасць сваім каштоўнасцям і святыням» (пераклад наш. — *В.Л., М.П.*) [5, с. 198].

У сваю чаргу, вылучэнне абноўленай нацыянальнай ідэі мае на ўвазе рэалізацыю комплексу мер, у тым ліку наступных:

– на навукова-тэарэтычным, філасофскім і канстытуцыйным узроўнях павінна быць прызнана, што нацыянальная ідэя выступае неад’емным элементам функцыянавання дзяржавы, рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, фарміравання дзяржаўна-прававой сферы;

– развіццё і падтрымка беларускай нацыянальнай культуры, вызначэнне, фармуляванне і замацаванне стратэгічных мэт і задач рэалізацыі культурнайпалітыкі, яе ключавых прынцыпаў і напрамкаў у прававых дакументах. Прычым гэтыя дакументы павінны ўлічваць той факт, што «…дзяржаўная культурная палітыка заклікана забяспечыць прыярытэтнае культурнае і гуманітарнае развіццё як аснову эканамічнага росквіту, дзяржаўнага суверэнітэту і цывілізацыйнай самабытнасці краіны» (пераклад наш. — *В.Л., М.П.*) [5, с. 195].

У якасці асноўных мэт культурнай дзяржаўнай палітыкі могуць быць вылучаны:

а) захаванне культурнай, гістарычнай спадчыны, яе выкарыстанне для выхавання і адукацыі;

б) усебаковая дзяржаўная падтрымка развіцця і пашырэнне сферы ўжытку беларускай мовы;

в) умацаванне этнічнай і грамадзянскай ідэнтычнасці, самаідэнтычнасці;

г) кансалідацыя беларускага грамадства з дапамогай прыярытэтнага гуманітарнага і культурнага развіцця;

д) стварэнне аптымальных умоў для ўсебаковага, гарманічнага выхавання і развіцця асобы.

Такім чынам, сёння фармуляванне новай нацыянальнай ідэі і фарміраванне комплекснай дзяржаўнай палітыкі ўсебаковай яе падтрымкі становіцца неабходным. Нацыянальная ідэя павінна ў поўнай меры адлюстроўваць асаблівасці нацыянальнага светаўспрымання, гістарычнага шляху і магчымых перспектыў прагрэсіўнага развіцця беларускага грамадства і дзяржавы.

1. Булгакаў В. Гісторыя беларускага нацыяналізму. Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2006. 326 с. Вернуться к статье

2. Вішнеўская І. У. Палітычная і прававая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пачатак XXI стст.) : манаграфія. Мінск : Тэсей, 2008. 296 с. Вернуться к статье

3. Лескінен М. В. Міфы і вобразы сарматызму. Вытокі нацыянальнай ідэалогіі Рэчы Паспалітай. М. : Ін-т славяназнаўства РАН, 2002. 178 с. Вернуться к статье

4. Мельник В. Идейно-ценностная основа общества. Идеология белорусского государства в тезисном изложении // Беларуская думка. 2015. № 6. С. 60–66. Вернуться к статье

5. Сальников В. П., Романовская Л. Р., Довгань Н. И. Гуманитарный суверенитет и идеологическая функция государства // Юрид. наука: история и современность. 2016. № 9. С. 193–200. Вернуться к статье